УДК 821.161.3.09

***Я.І. КЛІМУЦЬ***

# ВЫЯЎЛЕННЕ ВАЕННЫХ ПАДЗЕЙ У ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА "НА ШЛЯХАХ ВОЛІ"

*У артыкуле разглядаецца выяўленне Якубам Коласам першай сусветнай вайны ў паэме "На шляхах волі".*

Якуб Колас прыступіў да напісання паэмы "На шляхах волі" (першая назва "Рэвалюцыя") у 1925 г. Час у пэўнай ступені быў спрыяльным. Два гады таму асобным выданнем выйшла "Новая зямля", урэшце чытач атрымаў свежы экземпляр і "Сымона-музыкі", з вялікай зацікаўленасцю была сустрэта і аповесць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"У палескай глушы", першай з задуманага цыклу твораў, у якіх пісьменнік збіраўся паказаць новага героя, інтэлігента з сялян, на важных этапах гісторыі. Але грамадска-палітычная атмасфера ў краіне не тое, каб садзейнічала творчаму настрою, узнімала і натхняла на завяршэнне той задумы, а, наадварот, стварала вакол Коласа нейкі адчужальны вакуум. Вульгарызатарская крытыка шукала ў "Новай зямлі" кулацкія настроі, бачыла аджыўшыя тэндэнцыі і прарочыла твору нядоўгае жыццё. Неактуальнай, на думку некаторых крытыкаў, была і аповесць пра пошукі свайго шляху настаўнікам Лабановічам. Нават нямногія сур'ёзныя даследаванні не перакрывалі ідэалагічнай валтузні вакол твораў і асобы самога аўтара. Вядома, Якуба Коласа гэта нервавала, а сцверджанне, што ён не можа ўспрымаць сучаснасці, гэта значыць рэвалюцыйных пераўтварэнняў, выбівала з творчай каляіны. Але Колас-мастак не мог здрадзіць уласным творчым прынцыпам: у кожным творы выяўлялася ім перажытае і перадуманае, уласная гісторыя і гісторыя народа. Ён быў перакананы, што сучаснае вырастае з мінулага і ў значнай ступені прагназуе будучыню. Таму і не рэагаваць на выпады не мог, тым болей, што ўжо былі пагрозлівыя захады. У вядомай зараз "Лістападаўскай справе" Якуба Коласа чэкісты спрабавалі зрабіць галоўным кіраўніком антысавецкай падпольнай арганізацыі. У той час карныя органы яшчэ не адважваліся дзейнічаць нахабна-адкрыта і Коласу ўдалося абараніцца. Але гэтыя падзеі і прымушалі шукаць выйсце. І Якуб Колас вырашае напісаць актуальны твор пра рэвалюцыйныя падзеі, іх пярэдадзень і вынікі. Недзе так і з'явілася задума паэмы "Рэвалюцыя". Але і тут паэт зыходзіць з уласнага творчага прынцыпу: паказваць падзеі праз асабіста зведанае, перажытае, убачанае. Ды, магчыма, каб не даць падставы вульгарызатарскай крытыцы атаясамліваць галоўнага героя і аўтара, рашыў замаскіраваць уласны аўтабіяграфічны матэрыял. Таму прапаршчык Барыс Дзяжа, нядаўні студэнт, паходзіць з настаўніцкай сям'і з Вальні, ёсць у яго і каханая Насця Галута з суседняга хутара Засценне. Усё іншае звязана з жыццёвым вопытам Якуба Коласа.

Маючы мэту напісаць паэму пра пераломныя гістарычныя часы, Якуб Колас прыступаў да задуманага не без унутранай трывогі. "Спыніся, дружа, ды падумай... Ці будзе водгук тваім думам?" – нібы звяртаўся да сябе паэт перад далёкай і нялёгкай творчай дарогай. У невялічкім уступе ён акрэсліў ідэю твора:

Злажу я песню той краіне,
Што ў свет сваіх дарог шукае,
І песня водгулле спаткае,
І ў сэрцы след яе не згіне [1, с. 179].

Жаданне высакароднае і запатрабаванае часам. Але рэалізацыя яго аказалася не такой лёгкай, як здавалася на пачатку. Падзеі ў творы, па задуме, павінны былі пачынацца выключна ў вызначальны час, год рэвалюцыйных катаклізмаў. І тут Якуб Колас хацеў ісці ад канкрэтных гістарычных фактаў, але ў канцы дваццатых гадоў ужо немагчыма было паказваць супярэчнасці рэвалюцыйнага часу. Настойліва патрабавалася ўслаўленне магістральнага шэсця бальшавізму, таму ўсялякія сумненні, хістанні герояў успрымаліся як праяўленне варожасці і лёгка пераносіліся на светаўспрыманне аўтара. Але каб сцвердзіць складанасць пошукаў галоўным героем уласнай дарогі, паэт вымушаны быў даць перадгісторыю яго жыццёвых шляхоў. Гэта для творцы апынулася вялікай цяжкасцю, бо пачатковага этапу вайны ён дасканала не ведаў, не меў адпаведнага вопыту, таму толькі канстатуе тое, што Дзяжа тры гады ўжо на фронце, даўно адарваны ад родных мясцінаў.

Відавочна, што асноўным пафасам твора Якуб Колас меркаваў зрабіць асуджэнне вайны, падкрэсліць, што народ імкнецца да міру, стваральнай працы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Але пацыфісцкія настроі ўжо тады не ўхваляліся, паколькі палітычнай дактрынай маладой савецкай дзяржавы заставалася распаўсюджанне рэвалюцыйнага пажару на ўсю Планету. Таму зразумела, што асуджаць можна было толькі імперыялістычную вайну, а ўхваляць вайну палацам. Гэта не клалася ў гуманістычную канцэпцыю пісьменніка ў разуменні ім лёсу чалавека. Адсюль пачыналіся цяжкасці і супярэчнасці.

Яшчэ раз падкрэслім, што Якуб Колас адразу адасобіў галоўнага героя ад сябе. Барыс Дзяжа з пачатку вайны на фронце, у яго на Валыні засталася каханая Насця. Але гэта патрэбна было паэту для таго, каб узмацніць у творы інтымную лінію. Бо ў асноўным Дзяжа праходзіць па тых жа дарогах, што выпадалі на вайне і аўтару.

Паэма літаратуразнаўствам недастаткова прааналізавана[1]. Хто закранаў гэты твор пры разглядзе творчасці Якуба Коласа, аднназначна прызнаюць як няўдачу паэта. Ю.С. Пшыркоў піша: "Логіка разгортвання сюжэта паэмы давала падставы спадзявацца, што Барыс і Насця з'явяцца галоўнымі яе героямі, але так не атрымалася. Яны недзе "згубіліся" на паўдарозе, "непрыкметна адасобіліся" падзеі асабістага жыцця герояў ад агульнаграмадскіх" [2, с. 356-357]. Зыходзячы з такой пасылкі, вучоны і ацэньвае ўвесь твор. Аднак тут, здаецца, многае ўпушчана. Сапраўды, узнікалі супярэчнасці, але яны некалькі іншага плану, як здавалася Ю.С. Пшыркову. Лінія Насця – Барыс згубілася таму, што не вельмі лучылася з жаданнем паказаць лёс беларускага народа ў гістарычна адказны час. Нацыянальная прыналежнасць герояў прымушала паэта адыходзіць ад першаснай задумы. Галоўнае – выпадалі з твора беларусы і праблемы Беларусь. Так у працэсе напісання твора любоўная лінія сталася не патрэбнай. Твор пачынаў развівацца па ўласных унутраных законах, дзе на першы план вылучаліся палітычныя падзеі. Але тут узнікалі свае цяжкасці. У нейкай меры можна пагадзіцца з Ю.С. Пшырковым, што "на нядаўняе мінулае неабходна было глянуць з новай гістарычнай вышыні, а вось гэтага якраз і не давала зрабіць тагачасная вульгарызатарская крытыка" [3, с. 357]. Але ці толькі вульгарызатарская крытыка? І ці такая ўжо была тады гістарычная вышыня? Паэту неабходна было пры такім развіцці сюжэта паказаць барацьбу палітычных партый за ўладу. Але што мог зрабіць Колас, калі поўнасцю завалодала адна дактрына: праўда барацьбы толькі на баку бальшавікоў. Такія ўстаноўкі якраз і не маглі прывесці да філасофскага асэнсавання ўсіх тых сапраўды гістарычных падзей. Тым не менш, Якубу Коласу шмат што ўдалося паказаць, у эпізодах выявіць увесь драматызм і тую небяспеку, што ішла ад бальшавікоў. Іх лідэры падаюцца часам у непрываблівым выглядзе. Праўда, такое дапускаецца аўтарам толькі ў выказваннях з боку апанентаў, праціўнікаў бальшавікоў. Усё ж сёння відавочна, што гэтыя мастакоўскія характарыстыкі выглядалі дакладнымі, і ў той час дасведчаны чытач мог убачыць сапраўдныя аблічы "пралетарскіх барацьбітоў". У большасці яны выглядаюць сапраўднымі дэмагогамі. Вось як рэагуе ўзводны Талалай на філіпіку Міхаіла Бурдзіна "Далоў вайну! Далоў акопы!":

"Так то так – далоў захопы і акопы!"
Але скажы ты мне, Бурдзін:
Ці быў ты ў іх хоць раз адзін? [1, с. 318].

У гэтым плане не лепш выглядае і бальшавік Шкунда. Ён бударажыць масы, але працягвае аціраца ў тыле, каля штабоў, шпіталяў, дзе і праводзіць агіта-

---

[1] Арыгінальную ацэнку твору падае М.І. Мушынскі // Якуб Колас. Збор твораў: у 20 т. – Мінск, 2007. – Т. 1. – С. 94-110. Ярик

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цыйную працу. На фронт, пад агонь ворага ён не надта імкнецца. Таму паэту прыходзіцца галаслоўна ўзвялічваць свайго героя, ствараць свайго роду міф пра яго бясстрашнасць, адвагу. "Ён па прафесіі – рабочы, а па паходжанню – латыш", за рэвалюцыйную дзейнасць трапіў у Сібір, зараз накіраваны ў дзеючую армію для разгортвання прапаганды. Вось такі партрэт стварае паэт гэтага "нязломнага" барацьбіта:

Таварыш Шкунда ў гарнізоне
Не так даўно наверх усплыў,
Хоць ён вайскоўцам і не быў,
Але ў вайсковай плаваў зоне
І вельмі шкодзіў "абароне"
І на салдатаў меў уплыў.
Худы, касцісты, даўгавязы,
Пануры трохі на пагляд,
Ён вёў работу між салдат... [1, с. 322].

Вельмі цікавую характарыстыку падае аўтар Шкунду ў час яго выступленняў перад салдатамі пры абвяржэнні сказанага патрыятычна настроеным прамоўцам:

Глядзіш – а Шкунда ўжо, як злыдзень,
Выходзіць з натоўпу ўпярод,
Махае кепкаю ў народ
І пачынае "злы дух-скідзень",
Ці выйдзе што тут, ці не выйдзе,
Казаць якраз наадварот [1, с. 323].

Шкунду ў паэме прысвечана некалькі раздзелаў, нямала драматычных па напале пачуццяў і дзеянняў. Ён нават моцна збіты пасля аднаго з выступленняў, трапіў у шпіталь. Раздзелы пра шпітальнае жыццё таксама значныя, бо палярызуюць герояў. У іх падкрэсліваецца непрымірымасць, надзвычайная жорсткасць, паталагічная схільнасць бальшавікоў да садызму. Нармальных людзей проста палохаюць некаторыя заявы "непрымірымых", напрыклад, салдата, прыхільніка Шкунды:

А правакатарам, каторыя кадэты,
Эсэрам і афіцэрышкам
Пячонкі выгрызу за гэта
І выцягну з іх кішкі [1, с. 382].

Таму гуманістычна гучаць словы шпітальнай сястры:

О госпадзі, якая злоба!..
Пры чым жа афіцэры?..
На ўсіх найшла хвароба,
І сталі ўсе як звяры [1, с. 382].

Якуб Колас падкрэслівае, што часта помста ўзнікала стыхійна. Непісьменную, цёмна-забітую масу лёгка было накіроўваць на расправу з іншадумцамі. Асабліва з інтэлігенцыяй, прадстаўнікамі дваранства, бо на працягу рэвалюцыйнай прапаганды ў псіхалогіі людзей складваўся адпаведны воблік асабістага класавага ворага. У такім выпадку варожым станавілася ўсё, што не ўкладвалася ў сутнасць жыцейска-бытавых адносін.

Але ізноў жа справядліва Якуб Колас паказвае, што, па сутнасці, беларусы ў бальшавіцкіх справах не ўдзельнічалі, а значыць, шырокага бальшавіцкага руху

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў Беларусі не было наогул. Можа і таму ўсе падзеі адбываюцца далёка ад Беларусі. Часцей усё замыкалася на ўласных амбіцыях, а ў правадыроў – на празе да ўлады. Зрэшты, гэта вынікае і з фінальнага раздзела пра бальшавіцкі пераварот у Петраградзе:

І Шкунда ў радасці цалуе
Паўстанцаў трупу удалую,
Ён *помсту ўзяў* (выдз. мною. – Я.К.) за кроў сваю [1, с. 395].

Відаць, трэба пагадзіцца з даследчыкамі, што ў паэме часта губляюцца сюжэтныя лініі. Не стала вырашанай і тэма рэвалюцыйнай барацьбы і перамогі. Яна як бы адчуваецца перыферыйнай, не надта звязанай з жыццём і дзейнасцю галоўнага героя – Барыса Дзяжы. Гэта якраз і можна вытлумачыць тым, што ўласна аўтабіяграфічны матэрыял не клаўся ў сюжэтна-кампазіцыйную структуру. Таму твор і ўяўляецца фрагментарным. Наўрад ці змог бы Якуб Колас у апошніх двух задуманых раздзелах звесці ўсе сюжэтныя лініі ў адну. Прынамсі, яго герой застаецца зноў на раздарожжы, на ростанях.

Ды ўсё ж праўду пра той час Якубу Коласу ўдалося выявіць. Яна якраз яскрава паўстае ў шматлікіх эпізодах, пабочных сюжэтных лініях. І выключная дакладнасць характэрна для тых мясцін твора, дзе паэт выкарыстоўвае ўласна бачанае, перажытае, адчутае. Вайна імперыялістычная, а пасля і грамадзянская дала многа прыкладаў азіятчыны ў яе горшых стасунках. Нават некалькі мастацкіх штрыхоў падкрэсліваюць рознасць еўрапейскай і расійскай палітычнай і грамадскай культуры. Можна згадаць тыя мясціны ў паэме, у якіх казакі змушаюць мірнае насельніцтва падавацца ў бежанства. Колас якраз і паказвае бяздушнасць і жорсткасць выканаўцаў. Такім чынам, Колас імкнуўся да аб'ектыўнасці ў выяўленні ваенных рэалій.

Вось як піша Якуб Колас пра вымушаную эвакуацыю жыхароў Засцення:

Галута
Я не ганю вас, мае дзеткі,
А гоніць усіх нас вайна,
Праклята будзь навек яна!
У лес бягайце, у палеткі,
Хавайцеся там неўзаметкі –
Няхай мая будзе віна!.. [1, с. 202]

Жыхары хутара імкнуцца выратаваць сваё дабро, схаваць жывёлу ў лесе:

І сумятня пайшла ў Засценні.
Жывёлу гайда ў хмызнякі
На ўсякі выпадак такі... [1, с. 202]

Здзейсніць задуманае не ўдалося: перашкодзілі казакі. Далей паэт піша пра жорсткасць і бяздушнасць іх дзеянняў.

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Колас, Якуб.*** Збор твораў: у 14 т. / Якуб Колас. – Мн., 1976. – Т. 10.
2. ***Пшыркоў, Ю.С.*** Летапісец свайго народа. Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа / Ю.С. Пшыркоў. – Мн., 1982.
3. ***Лужанін, Максім.*** Колас расказвае пра сябе / Максім Лужанін. – Мн., 1964.

Паступіў у рэдакцыю 27.11.2007 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова